ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (1088) ● Чацвер, 17 красавіка 1975 г. ● Газета выходзіць з 1935 г. ● Цана 2 кап.

Сёння ў нумары:

● У ПАРТКОМЕ ● КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК ● XXXII СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ● СЛОВА МАЮЦЬ ХІМІКІ ● МАЛАДЫЯ ПАЭТЫ ГІСТФАКА ● АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні парткома былі абмеркаваны пытанні: «Аб ролі партыйнай арганізацыі факультэта па навучанню замежных студэнтаў па кантролю за ходам навучальнага працэсу замежных студэнтаў», «Аб рабоце камітэта камсамола хімічнага факультэта», «Аб правядзенні партыйнага сходу універсітэта» і інш.

Па першаму пытанню выступіў сакратар партбюро факультэта па навучанню замежных студэнтаў Г. А. Верабей. Абмеркаваўшы справаздачу, партком прыняў пастанову па разгледжанаму пытанню.

Аб рабоце камітэта камсамола хімічнага факультэта паведаміў у сваім выступленні сакратар камітэта камсамола універсітэта У. А. Навумовіч. Ён адзначыў, што камітэт камсамола хімічнага факультэта прыклаў шмат намаганняў, каб мабілізаваць камсамольцаў на выкананне рашэнняў партыі і урада па паспяховай падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Аднак у рабоце камітэта камсамола ёсць і некаторыя недахопы, на ліквідацыю якіх трэба накіраваць усе сілы.

Надаючы вялікае значэнне паляпшэнню і ўдасканаленню стылю работы камсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта, партком прыняў пастанову, у якой абавязаў партарганізацыю хімфака больш строга здзяйсняць кантроль за работай камітэта камсамола факультэта. Камітэт камсамола, у сваю чаргу, абавязаны павысіць узровень арганізацыі унутрысаюзнай работы.

Агульнаўніверсітэцкі партыйны сход вырашана правесці 23 красавіка.

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! ПАМНАЖАЙЦЕ СЛАЎНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАГА НАРОДА! АЗНАМЯНУЙЦЕ ЗАВЯРШАЛЬНЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ ЎДАРНАЙ ПРАЦАЙ І ВЫДАТНАЙ ВУЧОБАЙ!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1975 года).



У гэтым прыгожым сонечным будынку вучыцца вясёлы, працавіты народ—хімікі. Аб сённяшнім дні хімічнага факультэта, аб яго людзях і цікавых справах чытайце на 2—3 старонках.

Фота Д. ПРЭСА.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ПАДВЯЛА ВЫНІКІ

Завяршыла работу XXXII студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 105-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. На факультэтах прайшлі пленарныя пасяджэнні, падведзены вынікі. Было заслухана 1414 дакладаў, прадстаўленых 1522 аўтарамі—студэнтамі нашага універсітэта і іншых ВНУ краіны. Былі праведзены дні студэнцкай навукі, госці універсітэта пазнаёміліся з дасягненнямі у навукова-даследчай рабоце студэнтаў БДУ, сустрэліся з вучонымі і выкладчыкамі.

Студэнцкаму фестывалю навукі папярэднічала напружаная работа савета па НДРС, савета СНТ, універсітэта і факультэтаў, актывістаў СНТ В. Гайсёнка, П. Судніка, А. Сянько і многіх іншых.

Студэнцкая навуковая канферэнцыя з'яўляецца першым турам конкурсу на лепшую студэнцкую работу. Лепшыя даклады, праслуханыя і абмеркаваныя на секцыях, будуць дапушчаны на II тур—рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ.

На мінулай, XXXI навуковай канферэнцыі, было заслухана каля 900 дакладаў, з іх 663 накіраваны на рэспубліканскі конкурс.

Вынікі прайшоўшай XXXII канферэнцыі дазваляюць спадзявацца, што на рэспубліканскі тур 1975 года будзе накіравана вялікая колькасць работ, і ён будзе больш паспяховым для студэнтаў нашага універсітэта, чым мінулагодні.

Аднак саветам СНТ факультэтаў прадстаіць яшчэ шмат папрацаваць па арганізацыі і падрыхтоўцы работ на конкурс. **Я. ЦІТКОЎ,** старшыня савета СНТ.

ЗЛЁТ ВЫДАТНІКАЎ ВУЧОБЫ

Лепшых студэнтаў універсітэта сабраў у актавай зале БДУ IV злёт выдатнікаў. Адкрыў яго сакратар камітэта камсамола У. Навумовіч.

Прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар А. Я. Малышаў прывёў такія лічбы: 14,4 працэнта студэнтаў універсітэта вучацца толькі на «выдатна», 17 чалавек — імянныя стыпендыяты. Гэта людзі высокай грамадзянскай актыўнасці, авангард студэнцкай моладзі, будучыя высокакваліфікаваныя спецыялісты. Прыцягваць адстаючых да ўпартай працы, садзейнічаць павышэнню паспяховасці, ствараць атмасферу нецярпімасці да «двоек» — справа гонару выдатнікаў.

Ленінскі стыпендыят, дэлегат XXV з'езда камсамола Беларусі і XVII з'езда ВЛКСМ, студэнтка V курса філфака Любоў Тарасюк заклікала прысутных да яшчэ большай актыўнасці, адзначыла неабходнасць стварыць на кожным факультэце саветы выдатнікаў і кансультацыйныя пункты для адстаючых. Старшыня СНТ універсітэта аспірант фізфака Я. Ціткоў напомніў, што выдатная вучоба — гэта перш за ўсё вялікая праца.

Начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў зачытаў загад аб узнагароджанні граматамі і грашовымі прэміямі выдатнікаў вучобы, факультэцкіх актывістаў. Пасля выбараў савета выдатнікаў універсітэта быў прыняты Зварот удзельнікаў злёту да ўсіх студэнтаў БДУ (ён будзе надрукаваны ў наступным нумары).

Ю. КАРАЛЕЦКАЯ.

«ЧЫРВОНАЙ СУБОЦЕ» — УДАРНУЮ ПРАЦУ

Баявыя атрады, сфарміраваныя штабам працоуных спраў на геафаку, кожны дзень праводзяць «працоуны дэсант» на аб'екты.

Выдатнай работай на будаўніцтве інтэрната зарэкамендавалі сябе студэнты III курса аддзялення фізічнай геаграфіі пад кіраўніцтвам старасты Л. Янкоускай; II і III курса аддзялення эканамічнай геаграфіі. 23 чалавекі атрымалі падзякі за работу ад прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце С. А. Ерамеева.

З вялікім энтузіязмам працуюць студэнты на будаўніцтве вучэбна-геаграфічнай станцыі «Заходняя Беразіна». Выдатна спраўляюцца тут з работай студэнты 1 і 2 груп I курса геафака.

Кожны дзень група студэнтаў у складзе 25 чалавек працуе на уборцы аудыторый вучэбнага корпуса, ва універсітэцкім дварэ.

Актыўны ўдзел у правядзенні суботніка прымаюць студэнты матэматычнага факультэта. Пастаянна вядзецца работа у канторы зялёнай гаспадаркі Кастрычніцкага раёна. Пад кіраўніцтвам дацэнта В. І. Азаматавай студэнты IV курса матфака паспяхова працуюць на пасадачным масіве зелянгаса. Выдатна папрацавалі тут 3 і 8 групы II курса.

Вялікую дапамогу аказалі ў дзень суботніка другакурснікі, якія працавалі пад кіраўніцтвам дацэнта А. Н. Нахімоускай ва універсітэцкай бібліятэцы.

І. САВЕТКІНА.

***

На усіх факультэтах універсітэта створаны штабы, якія кіруюць падрыхтоукай і правядзеннем суботніка.

На пасяджэнні штаба працоуных спраў біяфака вырашылі, што студэнты будуць працаваць у вучэбна-доследнай гаспадарцы Шчомысліцы і зоамузеі. Акрамя гэтага, студэнтам V курса даручылі уборку лабараторый, кафедр і аудыторый факультэта.

Для тых, хто працуе у вучэбна-доследнай гаспадарцы, быу складзены план выездау на чале з кураторами. Дэкан факультэта разам з дырэктарам доследнай гаспадаркі правялі інструктаж старэйшых груп.

Кожны дзень у доследнай гаспадарцы працавала 18—25 чалавек. Да работы студэнты адносіліся старанна.

Асаблива вызначылся на рабоце студэнты 3 групы 1 курса, 1 групы II курса. А у табелі 3 групы IV курса было запісана: «Работа зроблена якасна, аб'ём работ выкананы датэрмінова».

Добра папрацавалі і рабяты 2 групы IV курса. Яны выканалі аб'ём работ на 33 рублі.

Поспехі у рабоце студэнтау тлумачацца не толькі добрай арганізацыяй суботніка з боку штаба працоуных спраў, але і клопатам вучэбна-доследнай гаспадаркі. Для студэнтау рэгулярна прадастаулялі транспарт, у час вызначалі аб'ём работ.

Т. ШЧОГАЛЬ.

***

Добра папрацавалі слухачы падрыхтоўчага аддзялення групы журналістаў і філолагаў (беларускага аддзялення) напярэдадні Усесаюзнага камуністычнага суботніка. Дзяўчаты ўпарадкавалі універсітэцкі двор, а хлопцы — гараж.

Усе працавалі з поўнай аддачай. Добры прыклад для таварышаў паказалі камуністы В. Станкевіч, П. Трубчык, камсамольцы П. Малько, М. Басаў і іншыя. Рабяты даказалі, што яны могуць не толькі добра вучыцца, але і добра працаваць.

Загадчык гаража М. Г. Кац перадау на імя дэкана падрыхтоўчага аддзялення пісьмовую падзяку за добрасумленную працу.

У дзень Усесаюзнага камуністычнага суботніка мы зноў дружна выйдзем на свята працы.

Н. АЎРАМАВА.



ВЫХОЎВАЕМ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ-ХІМІКАЎ

ГІСТОРЫЯ развіцця хімічнай навукі у Беларусі пачалася з 1930 года, калі на базе кафедр неарганічнай і арганічнай хіміі было створана хімічнае аддзяленне педагагічнага факультэта універсітэта. У 1931 годзе аддзяленне было ператворана ў хімічны факультэт, які і стаў асноўным цэнтрам падрыхтоукі высокакваліфікаваных кадраў хімікаў для навуковых устаповў, прамысловасці, вышэйшай і сярэдняй школы рэспублікі.

Цяпер на факультэце восем кафедр, якія вядуць падрыхтоўку студэнтаў па наступных спецыяльнасцях: неарганічная хімія, фізічная хімія, аналітычная хімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, хімія пауправаднікоу, радыяцыйная хімія, будова рэчыва. З 1973 года ажыццяўляецца асобна набор па педагагічнае і вытворчае аддзяленні нашага факультэта. Выпускнікі педагагічнага аддзялення будуць накіроўвацца для работы выкладчыкамі хіміі у школы і часткова у навукова-даследчыя установы рэспублікі. Вытворчае аддзяленне рыхтуе спецыялістаў для прамысловых прадпрыемстваў і навукова-даследчых устаноў.

Вучэбную і навукова-даследчую работу на факультэце вядуць высокакваліфікаваныя спецыялісты-хімікі, як правіла, выпускнікі нашага факультэта. Сярод іх — член-карэспандэнт АН БССР прафесар І. Р. Цішчанка, член-карэспандэнт АН БССР прафесар Р. Л. Старобінец, прафесар О. Р. Скараход, доктар хімічных навук В. В. Свірыдаў і іншыя. На факультэце працуе 8 дактароў, звыш 80 кандыдатаў навук, вялікая колькасць навуковых супрацоўнікаў, інжынераў.

Некалькі год назад наш факультэт адсвяткаваў сваё навасселле і зараз знаходзіцца у адным з лепшых карпусоў універсітэта.

За перыяд навучання на дзённым і вячэрнім аддзяленнях студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па асноўных дысцыплінах хімічнага профілю і па грамадскіх дысцыплінах.

Спецыяльную падрыхтоўку студэнты пачынаюць з шостага семестра: вывучаюць спецкурсы, займаюцца навукова-даследчай работай, праходзяць вытворчую і педагагічную практыку. Удзельнічаць у навукова-даследчай рабоце студэнты могуць нават з першага курса. Кафедры факультэта маюць для гэтага самае дасканалае абсталяванне.

Чатырохмесячная вытворчая практыка праводзіцца на базе перадавых прадпрыемстваў Мінска, Ленінграда, Харкава, Магілёва, Гомеля і г. д. Многія студэнты праходзяць практыку у навукова-даследчых установах.

Кожны год лепшыя студэнты накіроуваюцца на вытворча-азнаямленчую практыку у Іенскі універсітэт імя Ф. Шылера (ГДР). Для падрыхтоукі хімікаў па новых спецыяльнасцях мы практыкуем накіроуванне студэнтаў для завяршэння навучання і выканання дыпломных работ у іншыя ВНУ краіны ці ва універсітэты сацыялістычных краін.

На факультэце праводзіцца вялікі комплекс мерапрыемстваў па ідэйна-палітычнаму, эстэтычнаму і маральнаму выхаванню будучых спецыялістаў. Гэту работу мы імкнемся арганізаваць так, каб нашы выпускнікі выходзілі з універсітэта усебакова развітымі, мелі вопыт выхавацеляў, выступалі актыунымі прапагандыстамі, абаронцамі і носьбітамі камуністычнага светаусприымання.

В. САМАХВАЛ,
намеснік дэкана,
в. а. дацэнта.



Дацэнт кафедры фізічнай хіміі В. Ф. Бяляеў кансультуе студэнтау-дыпломнікаў.

ПРАКТЫКА

КРОК ДА ПРАФЕСІІ

Педагагічная практыка у студэнтаў хімфака пачынаецца на V курсе. Важнасць яе відавочная. Па-першае, педпрактыка — своеасаблівая праверка тэарэтычнай падрыхтаванасці студэнтаў, па-другое, яна выпрацоувае некаторыя навыкі работы з аудыторыяй, па-трэцяе, у час практыкі студэнты спрабуюць свае сілы ў будучай рабоце і, па-чацвёртае, педпрактыка дазваляе выявіць у кожнага арганізатарскія здольнасці. Добрыя выхавацелі, людзі, якія умеюць працаваць з калектывам, патрэбны не толькі для работы у школе, але і на вытворчасці, і у навукова-даследчых установах.

Практыка працягваецца восем тыдняў. За гэты час студэнты павінны пазнаёміцца з пастаноукай у школе вучэбнай, метадычнай і выхаваучай работы. Яны павінны даць самастойна не менш 10 урокаў, прыняць удзел у пазакласнай рабоце. У час практыкі студэнты праводзяць заняткі з адстаючымі, кіруюць работай хімічных гурткоу і факультатываў, арганізоуваюць і праводзяць хімічныя вечары, дапамагаюць выпускаць насценныя газеты.

Для азнаямлення з выхаваучай работай студэнты замацоуваюцца за класамі, дзе вядуць работу класнага кіраўніка.

Кола абавязкаў студэнтаў у час педпрактыкі вялікае, віды работы разнастайныя. Гэта дазваляе кіраўнікам практыкі усебакова вывучыць арганізатарскія здольнасці студэнтаў, іх тэарэтычную падрыхтоўку, адносіны да ускладзеных на іх абавязкаў.

Студэнты звычайна вельмі сур'ёзна адносяцца да падрыхтоукі і правядзення урокаў. Сваё захапленне хіміяй стараюцца перадаць вучням, развіць у іх цікавасць да свайго прадмета. Гэтаму садзейнічае таксама вялікая пазакласная работа, якую праводзяць студэнты. Настаунікі школ, як правіла, адзначаюць добрую тэарэтычную падрыхтоўку студэнтаў, вялікую зацікаўленасць і добрасумленныя адносіны да работы.

Самі студэнты лічаць, што педпрактыка ім неабходна. Вось што напісаў адзін з практыкантаў у сваёй справаздачы: «Усе праведзеныя ўрокі аказаліся вельмі карыснымі і павучальнымі для мяне. За гэты час я яшчэ раз змог пераканацца, якой складанай і адказнай з'яўляецца прафесія педагога. Яна патрабуе гуманнасці, дабраты, прастаты, ветлівасці, у меру строгасці, аб'ектыунасці, сумлення, высокай інтэлектуальнасці і глыбокіх ведаў свайго прадмета...».

Т. АДАМОВІЧ,
дацэнт.

СУСТРЭЧА З ГДР

У верасні 1974 года група студэнтаў - хімікаў БДУ праходзіла вытворча - азнаямленчую практыку у Іенскім універсітэце імя Шылера.

Насычаная праграма і дакладная арганізацыя паездкі дазволілі за кароткі час не толькі пазнаёміцца з тэматыкай і метадамі навуковых даследаванняў, што праводзяцца у лабараторыях секцыі хіміі факультэта прыродазнаучых навук, але і з жыццём нямецкіх студэнтаў, выдатнымі мясцінамі Цюрынгіі і Саксоніі, хімічнымі заводамі Лейна-Веркі імя Вальтэра Ульбрыхта, аптычнымі аб'яднаннямі «Карл Цэйс».

...Берлін. Кантраст старых і сучасных мікрараёнаў. Багацейшыя калекцыі музеяў.

...Гісторыя пранізвае кожны куток старога Патсдама. Палацы парка Сан-Сусі. Сведка капітуляцыі фашысцкага рэйха — замак Цэцыліенхоф.

...Веймар. Тут жылі Гётэ і Шылер, стварау сваю музыку Бах, а побач, на гары Этэрсберг — мемарыяльны комплекс на тэрыторыі канцлагера Бухенвальд.

...Дрэздэн. Вядомая карцінная галерэя, музей фаянса і фарфора Саксоніі. Палацавы комплекс Цвінгер і паляунічы замак Аугуста Моцнага.

...Гале - Нойштадт — горад-спадарожнік у акрузе хіміі Гале. Тут жывуць працоуныя хімічнага прадпрыемства Лейна-Верке, якое выпускае каля 10 працэнтаў усёй хімічнай прадукцыі ГДР.

Цікавыя сустрэчы, новыя сябры, знаёмства з рэспублікай, якая адсвяткавала 25-гадовы юбілей свайго існавання, былі вынікам гэтай паездкі.

І. МАРДЗІЛОВІЧ,
студэнт V курса хімфака.

АД ТЭОРЫІ—ДА ПРАКТЫКІ

Студэнты хімфака праходзяць сваю чатырохмесячную вытворчую практыку на ВТА «Інтэграл», заводзе пауправадніковых вентыляў (Маладзечна), на Магілёўскім заводзе «Лаусан», Лідскім лакафарбавым заводзе, на заводзе «Чырвоны хімік» у Ленінградзе, на Харкаўскім заводзе хімічных рэактываў і у навукова-даследчых інстытутах АН БССР.

Задача вытворчай практыкі — паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі у час навучання на факультэце, на аснове глыбокага знаёмства з работай прадпрыемства ці установы, дзе студэнты праходзяць практыку. У той жа час студэнты набываюць вопыт грамадска-палітычнай, арганізатарскай і выхаваучай работы. З рабочымі цэхаў, аддзелаў яны праводзяць гутаркі аб універсітэце, дапамагаюць маладым рабочым рыхтавацца да паступлення ва універсітэт, знаёмяцца з работай прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый.

Многія студэнты пасля практыкі выконваюць дыпломныя работы па тэмах, узятых на вытворчасці, і часта потым накіроўваюцца на работу на тыя прадпрыемствы і ў інстытуты, дзе праходзілі практыку.

У час практыкі для студэнтаў арганізуюцца экскурсіі ў цэхі, на прадпрыемствы, інстытуты. Вядучыя спецыялісты заводаў чытаюць лекцыі па асноўных пытаннях тэхналогіі, важнейшых напрамках тэхнічнага развіцця вытворчасці, эканоміцы вытворчасці і шляхах павышэння прадукцыйнасці працы.

Вытворчая практыка дапамагае студэнтам не толькі паглыбіць свае веды, але і расшырыць палітычны кругагляд, набыць навыкі самастойнай творчай дзейнасці ва умовах вытворчасці.

М. ГІЛЕВІЧ,
дацэнт.

ЗНАЁМЦЕСЯ: КАФЕДРЫ



Дэкан хімічнага факультэта дацэнт кафедры неарганічнай хіміі Г. А. Браніцкі і старшы лабарант О. П. Русакевіч праводзяць лабараторныя заняткі па электроннай мікраскапіі са студэнтамі V курса.

Фота **Д. ПРЭСА.**

ЗАЧАЦВЁРТАГА курса студэнты нашага факультэта пачынаюць спецыялізавацца у адной з галін хіміі. Выбар спецыялізацыі — добраахвотны, з улікам пажаданняў студэнтаў і кафедр.

Кафедра неарганічнай хіміі — буйнейшая кафедра факультэта. Яна рыхтуе студэнтаў па двух напрамках — неарганічнай хіміі і хіміі пауправаднікоў. Студэнты, якія спецыялізуюцца па неарганічнай хіміі, вывучаюць хімію каардынацыйных злучэнняў, будову малекул, неарганічныя палімеры і інш. Для студэнтаў, выбраўшых хімію пауправаднікоу, чытаюцца спецкурсы па хіміі цвёрдага цела, хімізму асноуных працэсаў, тэхналогіі пауправаднікових прыбораў і інш.

Вялікую ролю у падрыхтоуцы спецыялістаў адыгрывае спецыяльны практыкум. Кафедра неарганічнай хіміі пачала прымяняць новы метад правядзення спецыяльных практыкумаў, у час якіх студэнты займаюцца навукова-даследчай работай, выконваюць курсавыя работы.

На кафедры фізічнай хіміі таксама ажыццяўляецца спецыялізацыя па двух напрамках — фізічнай хіміі і хіміі пауправаднікоу. У час спецыялізацыі студэнты выконваюць курсавыя работы па тэмах кафедры. Спецыялізуючыся па гэтай кафедры, студэнты асвойваюць навейшыя метады даследавання, іх знаёмяць з новымі напрамкамі развіцця у навуцы.

Аналітычная хімія з'яўляецца прыкладной, але вельмі неабходнай навукай, без ведання якой немагчыма вырашыць ніводнай сучаснай задачы. Аналітычная хімія мае у сваім арсенале звышадчувальныя рэакцыі, сучасныя экспрэсныя метады аналізу, такія, як каларыметрыя, спектральны аналіз, спектрафотаметрыя, патэнцыяметрыя, паляраграфія і г. д. З усімі гэтымі метадамі знаёмяцца студэнты, якія спецыялізуюцца па кафедры аналітычнай хіміі. Акрамя гэтага, ім чытаецца спецкурс «Храматаграфія». У час спецыялізацыі студэнты знаёмяцца з такімі важнымі тэарэтычнымі напрамкамі у хіміі, як тэорыя іённага абмену і яе практычнае прымяненне, экстракцыя, яе тэарэтычныя асновы і практычнае выкарыстанне.

У сучаснай навуцы вялікая роля належыць арганічнай хіміі. Студэнтам на кафедры арганічнай хіміі чытаюцца спецкурсы, якія знаёмяць іх з тэорыяй будовы арганічных злучэнняў, з новымі класамі злучэнняў, новымі метадамі сінтэзу. У час спецпрактыкума студэнты вучацца сінтэзаваць розныя складаныя злучэнні, ідэнтыфіцыраваць іх.

Кафедра хіміі высокама-

У АТМАСФЕРЫ ЗАХОПЛЕНАСЦІ

Цяпер на хімічным факультэце універсітэта самастойнай навукова-даследчай работай занята каля 150 студэнтаў. Тэмы іх даследаванняў непасрэдна звязаны з навуковай работай кафедр. Рамантыка пошуку акрыляе. Многа жадаючых заняцца навукай прыходзіць у лабараторыі, але не усе вытрымліваюць дадатковую нагрузку. Жаданне атрымаць цікавыя вынікі не заўсёды рэалізуецца адразу — патрэбна цярплівая работа, вялікая тэарэтычная падрыхтоўка. Таго і іншага не ўсім хапае. У выніку застаюцца самыя настойлівыя, падрыхтаваныя, гатовыя на творчы пошук.

Безумоўна, навуковай работай нельга ахапіць усіх. Таму на кафедрах хімічнага факультэта элементы даследаванняў укараняюць у абавязковы вучэбны працэс. Часта работа, пачатая студэнтам на першым курсе, вызначае увесь яго далейшы шлях. Многія вядучыя вучоныя хімікі нашай рэспублікі пачыналі займацца навукова-даследчай работай з першых дзён свайго знаходжання у ВНУ. Гэта прафесары А. А. Шлык, І. М. Ярмоленка, І. Р. Цішчанка, У. М. Салдатаў, В. П. Мардыкін і іншыя.

Студэнты нашага факультэта прыцягваюцца да выканання гасдагаворных работ, да рашэння канкрэтных навукова-тэхнічных задач. Гэта садзейнічае павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, выхоўвае у студэнта арганізаванасць, сілу волі, уменне пераадолець цяжкасці. Як правіла, паспяховасць студэнтаў, што займаюцца навукова-даследчай работай, вышэй, чым у астатніх.

Расшыраюцца навуковыя сувязі нашага факультэта з ВНУ іншых гарадоў краіны. Студэнты прымалі удзел у навуковых канферэнцыях у Рызе, Кіеве, Калінінградзе, Уфе, Тбілісі, Саратаве, Таліне, Ужгарадзе. Выступленні нашых студэнтаў на канферэнцыях ВНУ Прыбалтыкі і Беларусі былі адзначаны граматамі.

Нядаўна пры кафедры радыяцыйнай хіміі была адкрыта студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, у якой студэнты заняты распрацоўкай тэм, маючых практычнае значэнне.

Работа у навуковых гуртках дапамагае выхаванню свядомасці, дысцыпліны, высокай патрабавальнасці да сябе. Усе гэтыя якасці неабходны спецыялісту.

Г. ПАЎЛЮЧЭНКА,
дацэнт.

НАШ ДОМ

Студэнты хімфака жывуць у інтэрнаце № 6 разам са студэнтамі факультэта прыкладной матэматыкі. Жывуць дружна. Усё цікавае, што робіцца у інтэрнаце, робіцца сумесна.

Інтэрнат стаў нашым родным домам, і таму мы стараемся, каб у нашым доме усё было як можна лепш.

Студсавет плануе сваю работу сумесна з прафсаюзным бюро абодвух факультэтаў і пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі ажыццяўляе яе практычнае выкананне.

Арганізуюцца лекцыі на разнастайныя тэмы, вечары пытанняў і адказаў, на якіх заусёды прысутнічае многа жадаючых пачуць адказ на сваё пытанне і пацікавіцца колам пытанняў таварышаў.

Рэгулярна выпускаецца радыёгазета. Студэнты слухаюць інфармацыю аб жыцці інтэрната, канцэрты па заяўках і інш.

Вялікую дапамогу інтэрнату аказвае факультэт. Партыйнае бюро і дэканат пастаянна цікавяцца бытам студэнтаў, дапамагаюць ускрываць і ухіляць недахопы.

Факультэт перадаў у інтэрнат тэлевізар «Гарызонт» у якасці пераходнага прыза лепшаму пакою.

Дом наш з кожным годам становіцца лепшым і больш добраўпарадкаваным.

Зараз усе мы рыхтуемся сустрэць Дзень Перамогі: збіраем бібліятэчку мемуарнай літаратуры, афармляем стэнд, прысвечаны 30-годдзю Перамогі, стараемся, каб у нашым доме было святочна і утульна.

У. ДЗЕНІСЕНКА,
старшыня студсавета інтэрната № 6.

ГАВОРЫЦЬ ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ

«У студэнтаў есць свая планета—гэта цалина», — спяваецца у песні. А для 200 студэнтаў - хімікаў, удзельнікаў працоунага семестра-74, гэтай планетай сталі будоулі Мінскай вобласці і горада Мінска, Мурманскай вобласці і Казахстана, сады і вінаградніки Малдавіі.

6 студэнцкіх будаунічых атрадаў хімфака, як і увесь шматтысячны атрад беларускіх студэнтаў, прысвяцілі трэці працоуны семестр 1974 года 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў. Былі падрыхтаваны лекцыі пра камсамол, пра беларускіх партызан, пра гераяу - воінаў, што вызвалялі Беларусь, пра аперацыю «Багацён». Некалькі атрадаў правялі паходы па месцах баёў 51-й дывізіі. За падрыхтоучы і рабочы перыяды адбылося больш 40 канцэртаў і лекцый, каля 300 кніг перададзена бібліятэкам сельскіх школ, арганізаваны 2 піянерлагеры «Спадарожнік», аформлена 6 стэндаў аб вызваленні Беларусі і аб горадзе-героі Мінску.

Байцы нашых СБА правялі у час работы 12 суботнікаў і 4 нядзельнікі у дапамогу калгасам. Атрады «Уран» і «Рубін» абсталявалі у падшэфных школах хімкабінеты. У многіх атрадах летам працавалі кансультацыйныя пункты для абітурыентаў.

Усе атрады асвоілі намнога большыя сумы капіталаукладанняў, чым было прадугледжана па дагаворах. Асабліва вызначыліся такія атрады, як «Праметэй» (ударная камсамольская будоуля у Лошніцы, камандзір Нікалайцаў), «Сонечны» (працавау на добраупарадкаванні горада-героя Мінска, камандзір Лашч) і «Купалінка», байцы якога у асноуным дзяучаты.

За лета минулага года студэнцкімі будаунічымі атрадамі хімфака асвоена 410 тысяч рублёў капіталаукладанняў.

Зараз на факультэце вядзецца падрыхтоука да працоунага семестра 1975 года.

У. АЖЭГАЎ,
студэнт IV курса.

Студэнтка IV курса хімфака Зінаіда Забалоцкая актыуна працуе у студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі пры кафедры радыяцыйнай хіміі.
Фота *Я. МАЎЧАНСКАГА.*

МАРШРУТЫ ПЕСНІ

Шэфству над сельскімі школамі камітэт камсамола хімфака заусёды удзяляу вялікую увагу. Наша агітбрыгада часта выступала перад школьнікамі з лекцыямі і канцэртамі. Студэнты расказвалі аб універсітэце, аб сваім факультэце.

У мінулым годзе у многіх з нас узнікла ідэя: а што, калі стварыць факультэцкую агітбрыгаду, выступленні якой будуць складвацца не толькі з асобных нумароу мастацкай самадзейнасці. Нам хацелася са сцэны паказаць наша студэнцкае жыццё. І работа закіпела. Да позняга вечара у камітэце камсамола гарэла святло у тыя дні. Былі напісаны новыя песні, вершы пра хімфак, і хутка быу гатовы сцэнарый выступлення. Нам хацелася, каб школьнікі, магчыма, будучыя студэнты хімфака, у думках маглі уявіць наш белакаменны будынак, падняцца разам з намі па яго лесвіцах, заглянуць у аудыторыі і лабараторыі, убачыць, як цікава і весела жывуць студэнты, як яны вучацца, адпачываюць, здаюць экзамены, працуюць у будаунічых атрадах.

Былі доўгія рэпетыцыі; першае выступленне адбылося ў Перажэрскай сярэдняй школе Пухавіцкага раёна.

А потым усё часцей і часцей мы уносілі у падрыхтаваны у дарогу аутобус музычную апаратуру, садзіліся самі і ехалі з песнямі ў чарговую «гастрольную» паездку.

7-я школа г. Маладзечна, 7-я школа г. Слуцка, Крупская сярэдняя школа Мінскага раёна, Ратамская школа-інтэрнат і іншыя— такія нашы маршруты за год. У лістападзе у нас была самая далёкая двухдзённая паездка у Тумілавіцкую школу Віцебскай вобласці. Яна была і самай цікавай, і самай удалай.

Вядома ж, у нас ёсць яшчэ рад цяжкасцей: і вопыту не хапае, і акцёрскага майстэрства. Часам нешта атрымліваецца не так, як хацелася б, але галоунае тое, што ва ўсіх членаў агітбрыгады ёсць жаданне выступаць.

І Жэня Макарэвіч, і Алег Івашкевіч, Лёня Лушчык, Алег Дзяжа, Жэня Радзіёна і усе астатнія члены агітбрыгады ўжо наўрад ці змогуць уявіць сваё студэнцкае жыццё без гэтых паездак.

Л. КРЫШКЕВІЧ,
адказная за шэфскую работу у камітэце камсамола хімфака.

ЗАЎСЁДЫ РАЗАМ

У нашай групе — адны дзяучаты. Мы вучымся разам на хімфаку амаль два гады і за гэты час вельмі падружыліся.

У першыя дні навучальнага года мы так склалі план работы, каб амаль усе мелі пастаянныя даручэнні.

Правялі вечар «З днём нараджэння». Павіншавалі нашых дзяучат, чые дні нараджэння былі летам. Усім вельмі спадабалася гэта свята. Яго падрыхтавалі члены нашага культмасавага сектара Люда Градкоуская, Іра Самойленка, Ларыса Лопан і Наташа Стадуб.

Вельмі цікава прайшла гутарка «Масавая культура і моладзь», якую правяла Лена Кашуба.

А яшчэ мы любім хадзіць у тэатры, асабліва у Беларускі. Пасля кожнай прагледжанай п'есы адбываецца жывы абмен уражаннямі.

І наогул мы вельмі любім паспрачацца. Зусім нядаўна прайшоў дыспут па фільму «Раманс пра закаханых».

Вось ужо два гады мы удзельнічаем у аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці факультэта і два гады запар наш курс займае першае месца. Вельмі прыемна усведамляць, што і наша група уносіць уклад у гэту перамогу. Нашы дзяучаты Галя Грышкевіч, Оля Гарбунова, Іра Самойленка пакарылі усіх сваім выступленнем.

Нам прадстаіць вучыцца разам яшчэ паутара года, і, вядома, у нас наперадзе яшчэ многа сумесных спраў.

С. СМОНДЗЕР.

ХІМФАКА

лекулярных злучэнняў рыхтуе спецыялістаў для палімернай прамысловасці і для навуковых установ адпаведнага профілю. Студэнтам, якія спецыялізуюцца на гэтай кафедры, чытаюць лекцыі аб структуры палімераў, аб метадах сінтэзу і метадах даследавання структуры і якасцей палімераў, іх знаёмяць з асноунымі дасягненнямі навукі і тэхналогіі. Спецпрактыкум па хіміі высокамалекулярных злучэнняу уключае работы аб сучасных спосабах сінтэзу палімераў. Акрамя гэтага, студэнтаў знаёмяць з прыроднымі высокамалекулярнымі злучэннямі, са спосабамі іх даследавання і перапрацоукі.

Кафедра радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі — адна з новых, але ўжо добра зарэкамендаваўшых сябе кафедр. Тут спецыялізуюцца студэнты па радыяцыйнай хіміі. Радыяцыйна-хімічны сінтэз, утылізацыя выпраменьвання рэактараў, ахова навакольнага асяроддзя — вось няпоуны пералік праблем, якія вырашае кафедра. Зыходзячы з гэтага студэнтам прапануоваюцца спецкурсы, якія знаёмяць іх з метадамі радыяцыйна - хімічнага сінтэзу крыніцамі выпраменьванняў, метадамі даследавання. Студэнты на спецпрактыкумах працуюць на лепшых айчынных і замежных храматографах, аналізатарах і г. д. У час спецпрактыкума «Аналогавыя машыны» студэнты вырашаюць розныя тэхналагічныя і навуковыя задачы.

Кафедра будовы рэчыва карыстаецца заслужанай папулярнасцю пры выбары студэнтамі спецыялізацыі. На гэтай кафедры студэнты даведваюцца аб самых новых даных у будове розных рэчываў. Вялікую ролю у падрыхтоўцы спецыялістаў адыгрываюць не толькі эксперыментальныя, але і тэарэтычныя курсавыя работы па энергетыцы малекул, спектрах малекул і г. д. Для эксперыментальных даследаванняў кафедра мае унікальнае айчыннае і замежнае абсталяванне.

Кафедра агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі створана нядаўна. Спецкурсы па хіміі элементаў, па фізіка - хімічнаму аналізу, па тэхналогіі атрымання асабліва чыстых рэчываў чытаюць студэнтам выкладчыкі кафедры. У хуткім часе да гэтага прыбавяцца спецкурсы па праграміраванаму навучанню і рад іншых. У час спецпрактыкума студэнты азнаёмяцца з метадамі фізіка - хімічнага аналізу, спосабамі атрымання асабліва чыстых рэчываў па сучасных методыках.

Такія напрамкі спецыялізацыі на хімічным факультэце. Спосабы яе няспынна удасканальваюцца, спецкурсы пастаянна узбагачаюцца новым матэрыялам. Няспынна мадэрнізуецца спецпрактыкум, у яго уводзяцца навейшыя метады даследавання, студэнтам прапануюцца больш удасканаленыя методыкі.

Г. КАЖУШКОЎ.



У навукова-даследчай лабараторыі кафедры фізічнай хіміі. Фота Д. ПРЭСА.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

У ДОБРЫ ЧАС!

МАЛАДЫЯ ПАЭТЫ ГІСТФАКА

Маладыя паэты гістфака... Доўгі час, калі у нас ва універсітэце заходзіла гаворка пра маладых паэтаў, з гэтымі словамі мімаволі асацыраваліся толькі філолагі, журналісты, не болей, хоць ва «Узлёт» у свой час заходзілі таксама паэты і з біяфака, і з геафака, і інш. Але каб столькі, зараз, ды з аднаго факультэта, ды не з філфака — гэта ўжо добрая навіна, з'ява, якую нельга не вітаць! Маладыя паэты з гістфака пішуць пра Радзіму, пра маладосць, пра яе лепшыя думы і пачуцці, пішуць класічным вершам і народна-песенным, спрабуюць таксама формы верлібра.

Няхай жа ў добры час пачынаюцца іх патхнёныя пошукі!

А. ЛОЙКА.

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Дзень добры, лясныя прасторы,
Дзень добры, красуня-зямля,
Хай свецяць век ясныя зоры
І мірная родзіць ралля!..
І будзь блаславлёны навекі,
Пах п'яны раскошных лугоў,
Празрыстыя сінія рэкі
У абдымках сваіх берагоў.

Эдуард ЗАЙКОЎСКІ, V курс.

***

Збіраюся буду у дарогу,
З сабой у цяжкі чамадан
Вазьму кавалачак мурогу —
Радзімай вытканы дыван.

Няхай трава пажоукне з часам,
Засохнуць кветкі без вады —
Са мною водар іх нязгасны,
Са мной Айчына назаўжды!..

Юрась БАНДАРОВІЧ, V курс.

НЕЗАБЫЎНАЕ

Самая вялікая аудыторыя геаграфічнага факультэта запоўнена студэнтамі. Кніжны стэнд «Мінск—горад-герой», кветкі, часопісныя столікі на маленькай эстрадзе. У гасцях у студэнтаў—былыя падпольшчыцы В. Ф. Мацюшка, А. В. Суслава, пісьменнік І. Г. Новікаў. Сёння — канферэнцыя чытачоў, прысвечаная 30-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй, па кнізе І. Г. Новікава «Рукі страляюць ва ўпор».

Мы усе чыталі гэту кнігу, бачылі тэлефільм, пастаўлены па ёй, і вось— сустрэча з аутарам.

Невялікія даклады аб такіх легендарных людзях, як І. Кабушкін, У. Амельянюк, І. Казінец, пра непакараную Беларусь, дзе са зброяй у руках змагаліся супраць фашызму тысячы партызан і падпольшчыкаў, стварыли у зале атмасферу, якая запаланшала да вялікай размовы пра гераізм, славу і подзвіг народа.

Асаблівую цікавасць выклікалі выступленні удзельнікаў падполля. В. Ф. Мацюшка, у доме якой была канспіратыуная кватэра, расказала пра дзейнасць падпольнага райкома, пра нелегальны выпуск газеты «Звязда», у распаўсюджванні якой удзельнічала і сама падпольшчыца. У 1942 годзе ёй давялося пакінуць горад і пайсці да партызан.

Самы непасрэдны удзел у падрыхтоўцы да выпуску падпольнай газеты прымала А. В. Суслава. Гэта яна, не адзін раз рызыкуючы жыццём, пераносіла шрыфт, які даставалі падпольшчыкі. У сорак другім, цудам пазбегнуушы арышту, яна пакідае Мінск і стварае у адной з вёсак Уздзенскага раёна невялікую падпольную групу, паладжвае сувязь з партызанамі.

У заключэнне канферэнцыі выступіў пісьменнік.

А. СТУПНІКАЎ.

КРЫНІЧКА

Крынічка - невялічка
Б'е з-пад кораня,
Сцюдзёная вадзічка —
Улюбёная мая.

Кропелькі-расіначкі,
Яны ўсё — у вачах,
Як слёзкі той дзяўчыначкі,
Без якое счах!..

Генадзь КУЛАЖАНКА, V курс.

***

Пакуль жыву — люблю Айчыну,
Яе лясы і мурагі,
І смех сланечнікаў ля тыну,
І мовы водар дарагі.

Нясу я ў сэрцы казку маці,
Якой калыску калыхала,
І тонкі пах аеру ў хаце,
І нашы песні на купалле.

ДЗІЧКА

На ўскрайку лесу, ля малой крынічкі,
Як дзяўчо вясною, расцвітае дзічка
І плыве аблокам у блакіце неба...
Большай прыгажосці мне
ў жыцці не трэба.

Уладзімір АРЛОЎ, V курс.

ТРЫ КОЛЕРЫ

Падаруй мне
Тры колеры:
Сіні,
Чырвоны,
Зялёны.
Я прылягу, як буду
Стамлёны,
У зялёнай
Траве-мураве.
Я нап'юся з сініх азёраў,
Каб дайсці да цябе.
А чырвоны ў сэрцы заусёды.
Падаруй мне
Тры колеры:
Сіні,
Чырвоны,
Зялёны.

Ігар ЧАРНЯЎСКІ, II курс.

ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ!

Закончыуся агляд мастацкай самадзейнасці факультэтау БДУ, прысвечаны 30-годдзю Перамогі савецкага народа над фашызмам. Ён яшчэ раз прадэманстраваў наяунасць ва універсітэце багацця талентау, сапраудных амататарау песні і танца.

Прагледзеушы канцэртныя праграмы, журы адзначыла **харавыя калектывы:** філфака (I месца), журфака (II месца), біяфака (III месца); **ансамблі:** танцавальны калектыу геафака (I месца), вакальна-інструментальны ансамбль журфака (II месца), жаночы квартэт філфака і дуэт акардэаністаў юрфака (III месца); **салісты:** дэкламатара журфака Э. Драбышэускую (I месца), танцора філфака М. Каменку (II месца), піяніста фізфака У. Андрэева (III месца).

Журы таксама улічыла добрае сцэнічнае рашэнне канцэртнай праграмы гістарычным факультэтам, адзначыла сцэнічную культуру драматычнай групы матэматычнага факультэта.

Пасля падвядзення канчатковых вынікаў месцы размеркаваліся наступным чынам:

I—факультэт журналістыкі (192 балы),

II—філалагічны факультэт (185 балаў),

III—геаграфічны факультэт (146 балаў), матфак (IV), гістфак і юрфак (V—VI), біяфак (VII), фізфак (VIII), хімфак (IX), ФПМ (X).

Агляд паказаў, наколькі узрасло майстэрства самадзейных артыстаў універсітэта, даказаў, што мастацтва у студэнцкім жыцці адыгрывае вялікую ролю.

СПРАВАЗДАЧУ ДАЮЦЬ АРТЫСТЫ

Кожны год ва універсітэце праходзіць агляд мастацкай самадзейнасці, і кожны год ён па-свойму цікавы і захапляючы. Раней амаль ні адзін факультэт не мог паспрачацца з філолагамі ў майстэрстве і масавасці. І сёлета філфак быў, бясспрэчна, на вышыні, аднак сур'ёзную канкурэнцыю яму склалі геаграфічны факультэт, факультэт журналістыкі, матфак. Вялікае уражанне на гледачоў зрабіла па-сапраўднаму прафесіянальнае выкананне харавой капэлай журфака такой складанай рэчы, як «Мізэрэрэ» Лоці. Буру апладысментаў выклікалі выступленні салісга В. Пучынскага, студэнцкага тэатра мініяцюр. І не дзіўна, што у аглядзе журфак заняў першае месца.

Зусім ушчыльную з ім стаяць іншыя факультэты. Задорна, весела станцаваў беларускую польку, закарпацкі танец і інш. ансамбль геафака, парадавалі сваім майстэрствам акардэаністы юрфака М. і А. Кручанкі. Гэта толькі нязначная частка таго, што заслужыла высокую ацэнку гледачоў і журы.

Т. МАЛМЫГА.

На здымках: 1) закарпацкі танец выконваюць географы. 2) спявае мужчынская вакальная група журфака; 3) драматычная група матфака паказвае урывак з п'есы Б. Васільева «А світанні тут ціхія...».

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 06618 Заказ № 675.

Рэдактар Д. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.